якой дазваляе фарміраваць і развіваць навыкі сумеснага музіцыравання, можна вывучаць хаця б у ІІІ і ІУ семестрах, але ні ў якім выпадку не пакідаць на УП і УІІІ семестры, як гэта прадугледжана ў плане (студэнты ж з 1 семестра ўжо займаюцца ў харавым класе!). Трэба было б падумаць і аб вывучэнні хаця б на другім курсе, як гэта мае месца ў аркестрантаў, дысцыплін "Расшыфроўка беларускіх народных песень" і "Аранжыроўка беларускіх народных песень", якія па плану ідуць толькі ў У1 семестры.

У1. Разгляд праблемы двухузроўневага навучання дазволіў нам прыйсці да наступных прапаноў аб пераемнасці ў навучанні бакалаўраў і магістраў.

1. Каб кардынальным чынам не ламаць навучальныя планы, якія сфарміраваліся, адысці ад аднаўзроўневай вышэйшай адукацыі, падрыхтоўку спецыялістаў з дыпломам бакалаўра можна ажыццяўляць на працягу васьмі семестраў. Галоўная задача ў навучанні студэнтаў па спецыяльных дысцыплінах павінна звесціся да развіцця індывідуальна-выканальніцкіх прафесійных якасцей, навыкаў ансамблевага музіцыравання, аркестравага (харавога) выканання - аркестравыя (харавыя) партыі, сольныя фрагменты твораў або сола ў суправаджэнні калектыву. У прынцыпе гэтыя ж пытанні, але на парадак ніжэй і ў меншай ступені цяжкасці вырашаюцца ў сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Таму, на наш погляд, быў бы рэзон выпускнікам гэтых устаноў па аналагу з замежным вопытам прысвойваць прафесійную ступень бакалаўра, а ў нашай навучальнай установе - ніжэйшую навуковую ступень бакалаўра. Для гэтага па аднаму з курсаў блока музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплін выпускнік павінен напісаць і публічна абараніць адпаведную дыпломную работу.

2. На пятым годзе навучання ў ВНУ бакалаўры рыхтаваліся б да абароны дыплома на наступную вучоную ступень, ступень магістра. Галоўнай задачай навукова-даследчай і творча-выканальніцкай падрыхтоўкі такіх спецыялістаў было б фарміраванне мастацка-аналітычнага мыслення. Іх навучанне можа ажыццяўляцца па аналагу асістэнтуры-стажыроўкі: блок агульна-навуковых дысцыплін; блок спецдысцыплін; спецкурсы; падрыхтоўка дыпломнай работы (нават пры творчым паказе неабходна напісаць і абараніць дыплом, як гэта практыкавалася на факультэце ваенных дырыжораў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі).

Бураўкін А.Г.,
канд.тэхн.навук, дацэнт
Зязюля А.Р.,
ст.выкладчык
Каленька Р.Р.,
канд.мастацтвазнаўства,дацэнт
Кульша В.М., ст.выкладчык
Шылкіна А.М., выкладчык
Шчасная Л.С., выкладчык

## ЭЛЕМЕНТЫ КАНСТРУЯВАННЯ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ НА АСНОВЕ КАМП'ЮТЭРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Узаемадзеянне мастацтва з дакладнымі ведамі прывяло да ўзнікнення новых тэхналагічных сродкаў увасаблення мастацкіх твораў (камп'ютэрная музыка, камп'ютэрная графіка).

Ужыванне сістэмных і камп'ютэрных сродкаў падтрымкі мастацкай творчасці спрыяе свядомаму засваенню ведаў аб мастацтве. Сістэмныя і камп'ютэрныя мадэлі мастацкіх твораў адлюстроўваюць гэтыя веды ў выглядзе канструкцыі з дакладнай многаўзроўневай структурай. Гэта дазваляе не толькі ўсвядоміць унутраную структуру твора (канструкцыі), але і ствараць (канструяваць) новыя творы ў межах і на аснове агульнай тэхналогіі з улікам узаемадзеяння новай канструкцыі з навакольным светам.

Распрацоўка элементаў сістэм канструявання мастацкіх твораў вядзецца зараз па напрамках:

- мадэліраванне кампанавання плоскіх каляровых геаметрычных вобразаў;
- мадэліраванне геаметрычнага малюнка танца;
- канструяванне музычных тэкстаў.

Ровіна Р.А.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## БЕСПЕРАПЫННАЯ ПАДРЫХТОЎКА БІБЛІЯТЭКАРАЎ ВА ЎМОВАХ УНІВЕРСІТЭТА

1. Неабходнасць удасканалення бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі, якая перажывае сур'ёзныя цяжкасці, звязаныя з сацыяльна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эканамічным становішчам дзяржавы, прыцілегласцю паміж шырокім профілем навучання і спецыялізацыямі, не выклікае сумненняў.

2. Сярод канцэптуальных падыходаў удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў - бесперапынная адукацыя (БА). Вытокі БА даследчыкі знаходзяць у далёкім мінулым. У цэласным выглядзе канцэпцыя была прадстаўлена на форум ЮНЕСКА ў 1965 г. П.Ленгранам, буйнейшым тэарэтыкам БА. Галоўная ідэя - ставіць у цэнтр усіх адукацыйных пачынанняў чалавека, якому неабходна стварыць аптымальныя ўмовы для поўнага развіцця яго здольнасцей на працягу ўсяго жыцця.

3. Сістэма бесперапыннай прафесійнай адукацыі бібліятэкараў-бібліёграфаў уключае:

- прафесійны адбор;
- падрыхтоўку спецыялістаў сярэдняй кваліфікацыі;
- падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай адукацыі і навукова-педагагічных кадраў;
- павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку спецыялістаў.

Галоўнае - стварыць пераемнасць, стыкоўку этапаў у адпаведнасці з сучаснымі задачамі.

4. Арганізацыя БА бібліятэкараў-бібліёграфаў у нашым універсітэце выпрацаецца па наступных напрамках:

- распрацоўка і ажыццяўленне вучэбнага плана са скарочаным тэрмінам навучання для атрымаўшых сярэднюю спецыяльную адукацыю;
- стварэнне навукова-вучэбнага комплексу "Беларускі універсітэт культуры - лінгвагуманітарны каледж", разлічанага на падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці "мэнеджэр інфармацыі бізнесу і бібліятэчнай справы";
- рэарганізацыя Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума ў Магілёўскі бібліятэчны каледж, які будзе ажыццяўляць падрыхтоўку па двух узроўнях (спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй і спецыялісту з паглыбленай сярэдняй адукацыяй).

5. У выніку вышэйазначанага і неабходнасці ўзнавіць, падняць на новы ўзровень работу па прафесійнай арыентацыі і ў сувязі з неабходнасцю пераходу да двухузроўневай сістэмы падрыхтоўкі ўзнікае патрэба распрацоўкі новых вучэбных планаў, праграм дысцыплін, падручнікаў, іншай метадычнай дакументацыі.

6. Першачарговымі мерапрыемствамі факультэта з'яўляюцца наступныя. Распрацоўка трох вучэбных планаў. Першы, з 5-гадовым тэрмінам навучання, для студэнтаў, якія залічаны ва універсітэт пасля сярэдняй школы, павінен прадугледжваць падрыхтоўку спецыялістаў двух узроўняў - бакалаўра і магістра.

Два другіх планы (для выпускнікоў лінгвагуманітарнага каледжа і Магілёўскага бібліятэчнага каледжа) таксама двухузроўневыя, але са скарочаным тэрмінам навучання. Прычым, на наш погляд, на апошняй (магістэрскай) ступені для кожнага студэнта распрацоўваецца індывідуальны план.

7. Самай пільнай увагі патрабуе этап, звязаны з паслядыпломнай адукацыяй спецыялістаў. На нашу думку, у складзе універсітэта тэрмінова неабходна стварыць інстытут павышэння кваліфікацыі. Зразумела, што бібліятэкары будуць павышаць кваліфікацыю на адпаведным факультэце гэтага інстытута.

8. Тэрмінова стварыць прафесійны часопіс, на старонках якога адлюстроўваліся б навукова-даследчыя, метадычныя і іншыя напрамкі дзейнасці спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы.

Платоненка Л.Ф.,
нам.дырэктара па навучальнай рабоце
Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума

## РЭФАРМАВАННЕ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ Ў МАГІЛЁЎСКІМ БІБЛІЯТЭЧНЫМ ТЭХНІКУМЕ ВА ЎМОВАХ ПЕРАХОДУ ДА ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Працэс удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу ў тэхнікуме пачаўся з абнаўлення зместу адукацыі па спецыяльнасці Г 01.02 "Бібліятэказнаўства і бібліяграфія" на падставе націянальнага аспекту дэідэалагізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Гэты працэс прадугледжвае пераасэнсаванне зместу вучэбных дысцыплін, напаўненне іх нацыянальным зместам, улік асноўных напрамкаў як агульнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі - гуманізацыі і гуманітарызацыі працэсу навучання, закладзеных ў законе "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

Працэс удасканалення пачаўся з распрацоўкі новага вучэбнага плана, які дзейнічае з 1 верасня 1992 г. Вучэбны план уключае шэраг

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ